

**23 чэрвеня 2012 года**
**№ 21 (150)**

# Жывапіс жыве, хоць Джэксан Полак усё сказаў

## Павольныя эстонцы, гарачыя венесуэльцы і талерантныя беларусы паказалі, хто на што здольны сёння ў жывапісе

У галерэях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць III Мінская міжнародная біенале сучаснага жывапісу COLORFEST. На выставе — палотны мастакоў з Беларусі, Украіны, Эстоніі, Малдовы, Латвіі, Літвы, Палесціны і Венесуэлы, якая сёлета з'яўляецца ганаровым госцем біенале. І заўважце, гэта не выстава сучаснага мастацтва, якіх вельмі шмат праводзіцца цяпер і на якіх можна пабачыць усё, пачынаючы з інсталяцый з туалетнай паперы і заканчваючы скульптурамі з шакаладу і чарнасліву.

COLORFEST — выстава менавіта сучаснага жывапісу. Здавалася б, цяпер, у век камп'ютарных тэхналогій, ніхто не піша карціны алеем, гуашшу, тэмперай або пастэллю. Не, яшчэ пішуць. Дакладней так: пішуць, і яшчэ як! Толькі з-за гэтага ўзнікае вельмі шмат розных пытанняў... Сучаснае мастацтва немінуча заблытваецца ў фармалізме і безыдэйнасці. Або ў звышідэйнасці і пераймальніцтве. Вось вам венесуэльскія карціны а-ля Фрыда Кало або Хуан Міро. Вось кубізм, фавізм, абстракцыянізм, мінімалізм... Але гэта ўжо нават не прагрэсіўна, бо мастакі не могуць прапанаваць абсалютна нічога новага ў гэтых стылях. Такое адчуванне, што каб яны напісалі нешта ў стылі галандскіх жывапісцаў часоў Адраджэння ў тэхніцы лесіроўка, то гэта выклікала б значна больш павагі і цікавасці хаця б з пункту гледжання маштабу зробленай працы. А так... Амерыканцы Джэксан Полак і Эндзі Уорхал, здаецца, сказалі на гэты конт усё яшчэ ў 1950-1960-х гг.

Па адной экспазіцыі складна гаварыць пра нейкія тэндэнцыі або кірункі ў сучасным жывапісе. Бо любая выстава — гэта непазбежна тусоўка. Самі ведаеце, як у тусоўкі трапляюць. А таму нельга сказаць, што, напрыклад, сучасны ўкраінскі жывапіс вось такі. Не дай Бог! Ды я і не паверу ніколі, што гэтыя аморфныя безлімітныя карціны ў пясочна-стэпавым стылі, прадстаўленыя на біенале, — усё, што могуць прапанаваць сучасныя ўкраінскія мастакі. Талерантны беларускі абстракцыянізм (Уладзімір Клімушка, Алесь Квяткоўскі, Зоя Луцэвіч, Кацярына Сумарава і... як сюды патрапіў Віктар Некрашэвіч, божухна!) на фоне гэтага ўкраінскага

нацюрмортна-пейзажна-кампазіцыйнага шэпту выглядае проста рэвалюцыяй нейкай.

Затое прыбалты крыху парадавалі. І хоць літоўскія, латышскія і эстонскія мастакі таксама грашаць на другаснасць аўтарскага стылю, але іх агрэсія захапляе. Яны не баяцца паставіць гледача ў няёмкае становішча, прымусіць яго пачырванець за тое, што ён пабачыў. Вось вам грымзолі ў стылі "на палях школьнага сшытка" ад літоўца Артураса Станчыкаса, а вось грымзолі ў стылі "я распісваю гэты чорны маркер" ад Асвальдаса Юшкі.

Прыбалтыйскае мастацтва глыбока канцэптуальнае і сацыяльна неабыякавае. Вось серыя партрэтаў эстонскай мастачкі Мал Нуке. На іх — эстонскія людзі-сімвалы, якія паўплывалі на светапогляд і менталітэт сучасных эстонцаў, напісаны на рапортным фоне з сімвалам "еўра". Супрацьстаянне сімвалаў. Глабалізацыя. Еўрапеізацыя. Змаганне ўніфікаванага і адметнага. Эстонскі пісьменнік крытычнага рэалізму Антон Хасэн Тамсаарэ, публіцыст Карл Роберт Якабсан, адзін з заснавальнікаў Эстонскага нацыянальнага музея Крысцьян Раўд, паэтка Лідзія Кайдула — знаёмцеся! А з "еўра", напэўна, усе і так ужо даўно знаёмыя.

Вось і яшчэ адзін сімвал. Сімвал неверагоднай сканцэнтраванасці сучаснага жывапісу на самім сабе — карціна "Аўтыст" эстонца Райта Росіна. На цёмна-чырвоным фоне — карак чалавека. Ён адвярнуўся ад усяго свету, ён інтраверт, ён аўтыст, ён глядзіць толькі ўнутр. Так і сучасны жывапіс. І гэта выклікае шмат розных пытанняў, нягледзячы на тое, што Джэксан Полак даўно ўсё сказаў.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**